УДК 338.48:502

Н.І. Здановіч, ст. выкл.
(БДТУ, г. Мінск )

# БАЛОТА ЯК ПРЫРОДНА-КУЛЬТУРНЫ АБ'ЕКТ: РОЛЯ Ў ГІСТОРЫІ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ І ВЫКАРЫСТАННЕ Ў ТУРЫСЦКА-ЭКСКУРСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Штогод 2 лютага адзначаецца Сусветны дзень водна-балотных угоддзяў. Падзея, якая мае непасрэднае дачыненне да нашай сінявокай краіны. Балоты – аб’ектыўная рэальнасць, неад’емная частка ландшафту Беларусі.

Навукоўцы сведчаць, што кожны гектар беларускіх балот ачышчае паветра, як 13 гектараў запаведнага лесу. Балотная вада па чысціні часта не саступае азёрнай, а можа быць, і перавышае яе з-за наяўнасці у ім моху – натуральнага антысептычнага рэчыва, што перашкаджае развіццю бактэрый, і такім чынам чысціць ваду. Вада ў балотах чыстая і абнаўляецца за пяць гадоў – гэта ўтрая хутчэй, чым у азёрах. Сяляне давяралі яе чысціні, толькі падчас сенакосу бралі на балота ільняную анучку, праз якую пілі ваду з балотных лунак.

Па плошчы балоты займаюць 13-14% тэрыторыі нашай краіны. Па ўзросце ім – ад 9 да 5 тыс. гадоў: утвараліся пасля адступлення апошняга ледавіка. Кожнае балота з'яўляецца цэлай экасістэмай. У наш час яны сталі паўнавартасным шматпланавым аб’ектам навукі. У іх назапашаны сапраўдны банк дадзеных пра раслінны і жывёльны свет (праз пылок, споры і часткі вегетатыўных органаў раслін, парэшткі розных жывёл), якія чакаюць свайго “прачытання” у будучым і здатныя паведаміць нам пра рэліктавыя расліны і жывёл, кліматычныя змены і характар рэльефу цягам тысячагоддзяў. Балоты – равеснікі нашых абарыгенаў, а значыць свае адкрыцці чакаюць і антраполагаў. Знаходкі “балотных цел” – парэштак людзей – звыклая знаходка ў розных частках свету (самаму старажытнаму экзэмпляру – 8000 гадоў).

Як складваліся ўзаемадачыненні паміж людзьмі і балотам у спракаветныя часы? Гісторыя паказвае, што яны былі living рознабаковымі і адлюстроўваюць адвечны антаганізм: прырода-чалавек, які выяўляўся ў змене адносін да гэтага прыроднага асяроддзя на працягу тысячагоддзяў. Толькі паступова балота таксама стала культурнай прасторай і часткай беларускай ментальнасці.

Асцярожнае, нават негатыўнае стаўленне да яго, страх перад балотнай тванню адлюстраваны ў нашай міфалогіі і фальклёры. Па паданні балота – стварэнне не боскае, але д’ябальскае (чорт, які падгля-

даў за Богам, хацеў, як Бог, ствараць свет, але ўдавіўся схаванаю ад яго ў роце зямлёю і выпляваў яе, ад чаго стварылася не цьвердзь зямная, а балота). Ад пяску, пушчанага ім па ветры, стварыліся не птушкі і маталі, як у творцы, а ўсялякі гнюс: камары, мошкі ды авадні.

Балоты як частка жывой прыроды былі аб’ектам пільнага назірання і вывучэння, насяляліся духамі, такімі рознымі, як рознымі былі тыпы балот. Балотнік, Багнік і Аржавенік адпавядалі тром іх тыпам. Балотных духаў антрапамарфізавалі (ім надавалі чалавекападобнае аблічча, надзялялі домам, рознымі характарамі ў залежнасці ад асяроддзя). Іх стараліся не крыўдзіць, задобрывалі.

Балота не любілі з-за бруду, гнюсу і небяспекі. Але ў яго вучыліся: назіранні за балотамі дазволілі па тыповых раслінах вызначаць на іх небяспечныя месцы. Людзей прываблівалі балотныя прасторы як сенакосныя угоддзі, ягаднікі – як крыніцы ежы. Так з’явілася патрэба ў выпрацоўцы тэхнікі хаджэння па болотах, што перадавалася з пакалення ў пакаленне. Так з’явіліся балотныя лыжы, балотаступы, легкія валакушы для перавозкі сена з балота. Па патрэбе навучыліся рабіць гаці-дарогі праз балоты (назапашваліся інжынерныя веды).

Балотная расліны сталі выкарыстоўвацца ў гаспадарцы: так з’явіліся трысняговыя дахі на гаспадарчых пабудовах і хатах, што эканоміла жытнюю салому на іншыя патрэбы. Сапрапель стала цудоўным угнаеннем палеткаў. Вербалозы верхавых балот і на ўскрайках іншых сталі сыравінай для лозапляцення. А да духаў балота дадаўся яшчэ адзін нязлобліві персанаж: Лазавік разам з гарэзлівымі Лознікамі. З пераходам да аселага ладу жыцця на мяжы эпохі бронзы і жалезнага веку, прыкладна 4 тысячы гадоў таму назад, узрасла ваенная небяспека і патрэба ў абароне не толькі племянной тэрыторыі, але і людзкіх рэсурсаў. Гэта стала прычынай з’яўлення яшчэ адной функцыі балот: абарончай. Да балотных выспаў пракладаліся таемныя сцежкі, па якіх у выпадку небяспекі перабіраліся людзі разам з маёмасцю. Балотныя гарадзішчы і гарадзішчы-сховішчы гэтага часу даследуюцца археолагамі канца 20 – пачатку 21 стст. на Палессі і на тэрыторыі Падзвіння. Абарончую функцыю балоты захоўвалі і падчас войнаў 16-17 ст., і нават яшчэ ў Другую сусветную вайну: менавіты сярод балотаў утвараліся партызанскія лагеры і разгортваліся партызанскія шпіталі. Балотны мох выкарыстоўваўся там як антысэптык.

Пасля вайны з утварэннем калгасаў балоты выкарыстоўваліся для прыватнага сенакашэння. А з надыходам зімовых марозаў усё навакольле выбіралася на балоты па бясплатныя дровы: алешыны з дыяметрам ствала ў 5-8 см нарыхтоўваліся і санкамі вывозіліся на

край балот да вясны. Тым самым зберагаліся і пашыраліся плошчы сенажацяў. Аднак адносіны да балотаў з боку дзяржавы змяніліся на негатыўныя з-за імкнення павялічыць плошчы пад ворыўную зямлю і сенажаці, што прывяло да асушэння балот пачынаючы з 60-х гадоў 20 ст. Працэс спыніўся толькі пасля ўзнікнення экалагічных наступстваў (высыхалі калодзежы і мялелі рэкі, распаўсюджваліся пыльныя буры). Цяпер мы назіраем працэс рэанімавання балот праз паўторнае забалачванне, што патрабуе вялізных выдаткаў.

Балоты выконвалі сваю ахоўную функцыю не толькі для людзей, але і для прыродных аб'ектаў: флоры і фауны. Менавіта на балотах захаваліся многія віды раслін (15% з унесеных у Чырвоную кнігу Беларусі). Балоты сталі домам для птушак і жывёл, у тым ліку краснакніжнікаў (прыкладам, такіх, як гігантскія кажаны, вяртлявая камышоўка). Міжнародны статус аховы Рамсарскага ўгоддзя маюць 26 тэрыторый Беларусі, якія асабліва ахоўваюцца.

Выключная роля балот у захаванні культуры. Адзін з самых цікавых і архаічных, традыцыйных, рэгіёнаў Беларусі – Палессе (усходняе і заходняе) – сфарміраваўся менавіта дзякуючы наяўнасці балотаў, якія адыгралі ролю своеасаблівага ізалятара і кансерватара традыцый. Малазямельле стымулявала развіццё рамеснай дзейнасці, найперш ганчарства. Хрэстаматыйны прыклад – вёска Гарадная, што ў Столінскім раёне, дзе нават у пачатку 20 ст. існаваў ганчарны цэнтр з адметнай традыцыяй, вытокі якой прасочваюцца ў ганчарстве Палесся 800-гадовай даўнасці. Менавіта тут нарадзілася прыслоўе "на гліне грош не гіне". Захаванне традыцый у побытавых рэчах Гомельскага Палесся дэманструюць экспанаты "Чарнобыльскага фонда" аддзела старажытнай беларускай культуры НАН Беларусі.

Балотная глеба (торф) – прыродны кансервант, а балоты – патэнцыйны захавальнік старажытных скарбаў – прадметаў матэрыяльнай культуры, некаторыя з якіх налічваюць не адно тысячагоддзе. Прыкладам могуць быць матэрыялы з раскопак стаянак Крывіна Сенненскага і Асавец Бешанковіцкага раёнаў Віцебскай вобласці, даследаванне якіх перыядычна працягваецца з 60-х гг. 20 ст. У перавільготненай глебе захаваліся вырабы з дрэва і косці ўзростам у 4-5 тыс. гадоў. Нават і больш маладыя знаходкі, як, напрыклад, меч-корд 500-гадовага ўзросту цудоўнай захаванасці з балота ля сцен Лідскага замка – унікальны артэфакт. Ён знойдзены выпадкова, пры меліярацыйных працах ля сцен замка.

З усіх відаў папулярнага ва ўсім свеце экалагічнага турызму, "балотны" турызм – самы экалагічны. Ён актыўна развіваецца ў краінах Скандынавіі, у Прыбалтыцы і Польшчы. Яго "экалагічнасць"

– найперш у спосабе перамяшчэння: ён пешаходны, і арганізаваны. Пракладзеныя па балотах экалагічныя сцежкі праходзяць па спецыяльных насцілах. На ўскрайках балот будуюцца назіральныя вышкі. Яны прызначаюцца не толькі для назірання за птушкамі (таму што на беларускіх балотах, як вядома, сустракаецца больш 40% відаў птушак краіны, а бёрдвочынг і ў нас набірае папулярнасць), але і для сузірання краявідаў як адзін з элементаў ландшафтатэрапіі. Дзякуючы насычанасці балотнага паветра кіслародам яно нават перавышае магчымасці сасновых лясоў у станоўчым ўздеянні на здароўе. Чысцейшае паветра і рэлаксацыя краявідамі і станоўчымі эмоцыямі ад сустрэчы з незвычайным, шырокія далягляды (“адкрытыя” ландшафты) станоўча ўплываюць і на зрок экскурсантаў. Дзякуючы таму, што балоты – цэлая экасістэма, на аснове экалагічных сцежак магчыма арганізацыя і правядзенне разнастайных тыпаў прыродазнаўчых ці экалагічных экскурсій: біялагчных, заалагічных і нават спецыфічных энтамалагічных (на нашых балотах сустракаюцца 35% кузурак краіны).

Акрамя прыродна-экалагічнага турызму, балоты становяцца месцам арганізацыі фестывальнага турызму. Прыкладам можа быць фестываль сенакашэння на базе балота Ельня. Тым самым турызм спрабуе дапамагчы і ў вырашэнні некаторых праблем захавання балот: гэта зарастанне месцаў гнездавання і адпачынку птушак на шляху іх міграцыі. Яшчэ адзін з відаў турызму, папулярны ва ўсім свеце – “сабыційны” турызм. Прычынай арганізацыі такіх масавых мерапрыемстваў звычайна становяцца гістарычныя падзеі. Аднак прыродны турызм таксама мае тут значныя перспектывы, абапіраючыся на відовішчныя цыклічныя прыродныя з’явы, якія адбываюцца на тэрыторыі балот. Як прыклад, заслугоўвае ўвагі экалагічны фестываль “Жураўлі і журавіны Міерскага краю”, прымеркаваны да часу масавага збору журавін, падчас якога прапануецца вялізная разнастайнасць страў з журавін: пірагі з журавінамі, журавінавы морс, свежыя ягады. Адначасова на балоце Ельня адбываецца сапраўднае “жураўлінае” свята, якое прывабівае вялікую колькасць турыстаў. Яшчэ адна праблема сучасных балот – зарастання іх не толькі травамі, але і кустамі, што замінаюць гнездаванню і адпачынку птушак на шляху міграцыі. Для змагання з апошняй праблемай, магчыма, можна прадумаць варыянт правядзення спаборніцтва па цімберспорту з выкарыстаннем балотнай тэрыторыі.

Такім чынам, самакаштоўнасць балот як прыроднай экасістэмы дапаўняецца іх гісторыка-культурным значэннем, а ўсё разам павінна стаць рэсурсам пашырэння турыстычнага патэнцыялу тэрыторыі нашай краіны.